ВОЛЬНЫЙ ТРУД
Белосток
БССР
12
16 МАЯ 40 5.
346



# ГРОДНЕНСКІ ЛЯЛЕЧНЫ ТЭАТР

У Беластоку з поспехам выступае Гродненскі дзяржаўны лялечны тэатр.

Гэты тэатр, створаны ў пачатку 1940 года з пастаяннай базай у Гродне, налічвае зараз 15 чалавек творчага персанала, на чале якога стаіць мастацкі кіраўнік тав. В. І. Ярэма.

Усе работнікі тэатра — артысты апрача Ярэмы, перад прыходам Чырвонай Арміі нічога агульнага не мелі з лялечным тэатрам.

Асноўную найбольшую дапамогу ў арганізацыі тэатра аказаў калектыў Маскоўскага дзяржаўнага цэнтральнага тэатра лялек С. В. Образцова, які некалькі месяцаў назад выступаў у Беластоку і Гродне.

Работнікі Гродненскага тэатра асабліва ўдзячны артыстам маскоўскага тэатра т. т. Рывазаву і Байкаву за абучэнне іх тэхніцы работы з лялькамі.

Асноўнай задачай тэатра з'яўляецца абслугоўванне моладзі і дзяцей.

Тэатр выступае зараз са сваёй першай праграмай „Цырк Тарабумба". Гэта марыянетачнае відовішча ў двух дзеях на польскай мове ў пастаноўцы тав. Ярэмы. (Тэкст відовішча—маэстра Пюрэчкі, выкананне лялек—З. Ляснеўскай - Ярэма, механізацыя лялек С. Малькевіча і мастацкая афармленне Б. Шэскіна.)

Калі тэхнічны бок тэатра (асабліва лялькі і іх механізацыя) даволі добра пастаўлен, то гэтага, на жаль, нельга сказаць аб тэксце відовішча. Адкрыта кажучы, спектакль у выхаваўчых і ідэалагічных адносінах нічога не дае маладому гледачу.

Несумненна, што лялечны дзіцячы тэатр у Беластоцкай вобласці патрэбен, асабліва вялікую ролю ён адыграе, калі адпаведныя арганізацыі забяспечаць яго грузавой аўтамашынай. Тады тэатр зможа абслугоўваць самыя аддалёныя вёскі і мястэчкі нашай вобласці.

Ні ў якім разе тэатр не можа астацца пры старым рэпертуары. Неабходзен новы, жывы, юмарыстычны савецкі рэпертуар.

Чаму-б кіраўніцтву тэатра не выкарыстаць казачны матэрыял, як лялечныя п'есы „Чароўная галоша", „Па шчупінаму вяленню" і іншыя, што ўваходзяць у рэпертуар тэатра Образцова?

Тэхнічныя магчымасці тэатр мае поўнасцю. Артысты, якія за такі кароткі тэрмін (некалькі месяцаў) авалодалі складанай лялечнай тэхнікай, несумненна, людзі здольныя. Справа за добрым савецкім рэпертуарам, за злабадзённым сучасным юмарыстычным тэкстам.

Абласны аддзел мастацтваў павінен удзяліць больш увагі Гродненскаму лялечнаму тэатру і дапамагчы яму стаць на рэйкі сапраўднага савецкага мастацтва.

**В. Бемаў.**